**Алена Філатава,**
**Валянціна Яноўская**

# Евангеліцка-лютэранская і евангеліцка-рэфармацкая канфесіі ў палітыцы Расійскай імперыі

**Alena Filatava, Valiantsina Yanouskaya**

**Evangelical Lutheran and Evangelical Reformed denominations in the policy of the Russian Empire**

It is shown that legislative regulation of the Protestant denominations during XIX c. created normal conditions for their development. It is alleged that this policy was based on belief of authorities in greater usefulness of these denominational groups than harm.. The sharp changes in government policy towards Protestant denominations occurred at the beginning of the First World War.

*Keywords:* Russian Empire, Western provinces, Lutheran and Reformed confessions, clergy

**Олена Філатова, Валентина Яновська**

**Євангельсько-лютеранська і євангелічно-реформаторська конфесії у політиці Російської імперії**

Показано, що законодавче регулювання діяльності протестантських конфесій упродовж XIX ст. створювало нормальні умови для їх розвитку. Стверджується, що ця політика базувалась на переконаності влади у більшій корисності зазначених конфесійних груп, ніж шкідливості. Різкий поворот в державній політиці щодо протестантських конфесій стався на початку Першої світової війни.

*Ключові слова*: Російська імперія, західні губернії, євангельсько-лютеранська і євангельсько-реформатська конфесії, духівництво

Гістарыяграфія прававога статуса пратэстанцкіх канфесій на далучаных да Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. землях нешматлікая. У працы польскай даследчыцы Е. Алабрудзінскай вызначана агульная тэндэнцыя для пратэстантаў заходніх губерняў і Царства Польскага перыяду XIX ст.: рост лютэранскага вызнання ў сувязі з нямецкай каланізацыяй тэрыторый і ўпадак кальвінісцкага[1]. Агульным у характарыстыцы ўзаемаадносін паміж пратэстацкімі канфесіямі і дзяржавай была адзнака дастаткова лаяльнага стаўлення расійскага ўрада да пратэстантаў. Так, прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Дз. Цвятаеў адзначаў, што асобы пратэстанцкага веравызнання «пользовались явным преимуществом пред католиками»[2]. На гэтую характэрную рысу звяртаў увагу і польскі даследчык В. Студніцкі. Закрыццё ж у 1824 г. гімназіі ў Кейданах, а ў 1864 г. у Слуцку, ён тлумачыў не канфесійнымі

матывамі, а чыста палітычным супрацьстаяннем палякаў[3]. Гэтай думкі працягвае трымацца і сучасная гістарыяграфія. Некаторыя новыя аспекты, што тычацца дзяржаўнай палітыкі і структурнага ўладкавання пратэстанскіх канфесій у імперыі, раскрыты ў працах сучасных літоўскіх і беларускіх даследчыкаў[4].

Зыходзячы з прагалаў у даследаванасці тэматыкі ў дадзеным артыкуле ставіцца задача прааналізаваць палітыку ў сферы кіраўніцтва і рэгулявання дзейнасцю евангеліцка-лютэранскай і евангеліцка-рэфармацкай канфесій на працягу ўсяго XIX – пачатку XX ст., удакладніць царкоўную структура і колькасць вернікаў на беларускіх землях.

Дзяржаўны надзор па адміністрацыйных справах над евангеліцка-лютэранскай і евангеліцка-рэфармацкай цэрквамі ў Расійскай імперыі яшчэ з часоў Пятра I ажыццяўляў Св. Сінод, які рэдка ўмешваўся ва ўнутраныя справы пратэстантаў, абмяжоўваючыся зацвярджэннем выбраных пастараў. З 23 лютага 1734 г. галоўным органам кіравання замежнымі хрысціянскімі веравызнаннямі стала Юстыц-калегія Ліфлянскіх, Эстлянскіх і Фінлянскіх спраў, якая да 1810 г. была падпарадкавана Сенату[5]. Указам ад 25 ліпеня 1810 г. гэтыя функцыя перайшлі да Галоўнага ўпраўлення замежных веравызнанняў, якое пасля стварэння Міністэрства духоўных спраў і народнай асветы (маніфест ад 17 кастрычніка 1817 г.) увайшло ў склад першага дэпартаментата[6]. Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў стаў апошнім дзяржаўным органам Расійскай імперыі, якому падпарадкоўваліся пратэстанцкія цэрквы па адміністрацыйных справах. Па судовых справах яны падпарадкоўваліся Сенату.

З далучэннем пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай значнай часткі Усходняй Беларусі, дзе ў Полацкім і Магілёўскім намесніцтвах пражывала толькі 4908 вернікаў евангеліцка-лютэранскай і евангеліцка-рэфармацкай канфесій, урад Расійскай імперыі некаторы час не прадпрымаў ніякіх практычных мер для іх адміністрацыйна-структурнай рэарганізацыі. Пратэстанцкія канфесіі працягвалі кіравацца так званым «дысідэнцкім правам». Першай спробай умяшальніцтва дзяржаўных органаў у кіраванне пратэстанцкімі канфесіямі стаў разгляд гэтага пытання на пасяджэнні Дзяржаўнага Савета 26 лютага 1789 г., дзе выказвалася думка, што яго патрэбна арганізаваць па прыкладу каталіцкай царквы[7]. Але канчатковае рашэнне ў той час так і не было выпрацавана.

На беларуска-літоўскіх землях, што засталіся пасля першага падзелу ў складзе Рэчы Паспалітай, Віленскі лютэранскі сінод заснаваў кансісторыю, якая пачала сваю працу ў 1782 г.[8]. Для яе ў 1785 г. Генеральным Сінодам (у Біржах) быў складзены спецыяльны статут, згодна з якім кансісторыя

складалася з 10 членаў: 3 – ад духавенства, 6 – свецкіх (з іх 3 прадстаўнікі шляхты) і сакратара. Члены кансісторыі павінны былі збірацца раз у год у Вільні і падпарадкоўваліся Сіноду лютэранскіх супольнасцяў. Сінод збіраўся кожныя два гады і зацвярджаў членаў гэтай кансісторыі (выбіраліся ўсімі лютэранскімі прыходамі). Ён жа быў і апошняй інстанцыяй ў вырашэнні спраў лютэранскіх прыхаджан[9].

Новыя спробы ў кірунку рэгулявання дзейнасці пратэстанцкіх канфесій пачалі прадпрымацца пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. У 1797 г. быў скасаваны Генеральны Сінод у Біржах. Сенацкім указам ад 18 верасня 1805 г. літоўскаму ваеннаму губернатару графу Л. Бенегсену было загадана прааналізаваць магчымасць далейшага выкарыстання дысідэнцкага права і прадставіць свае меркаванні. Віленская лютэранская кансісторыя, да якой звярнуўся губернатар, не змагла знайсці пераканаўчых звестак, што дысідэнцкае права было дапушчана расійскім урадам. Тым не менш, да яго працягвалі звяртацца да пачатку 1830-х гадоў, пакуль не быў выпрацаваны статут для гэтых канфесій.

Статут быў прыняты ў 1832 г. Згодна з ім вышэйшае кіраўніцтва евангеліцка-лютэранскай царквой ажыццяўляла Генеральная кансісторыя, якая складалася з прэзідэнта (свецкай асобы), віцэ-прэзідэнта (духоўнай асобы), двух свецкіх і двух духоўных членаў. Усе яны прызначаліся імператарам з тых кандыдатаў, што былі абраныя адпаведнымі органамі. Выбары прэзідэнта ў розных кансістарыяльных акругах праводзіліся па-рознаму. У Курляндскай акрузе яго выбіралі мясцовыя дваране, лютэране па веравызнанні. Яны ж выбіралі і віцэ-прэзідэнта, вышэйшага духоўнага саноўніка кансісторыі. Ён меў сан генерал-суперінтэнданта (у іншых кансістарыяльных акругах – суперінтэнданта, але правы ў іх былі аднолькавыя). Віцэ-прэзідэнт кансісторыі кіраваў і назіраў за ўсімі духоўнымі справамі ў акрузе, вёў спісы духоўных асоб, атэставаў іх, праводзіў візітацыю цэркваў, разбіраў спрэчкі паміж пастарамі.

Мясцовае кіраўніцтва справамі евангеліцка-лютэранскай царквы ажыццяўляла духоўная кансісторыя, якую ўзначальваў пробст. Ён падпарадкоўваўся генерал-суперінтэнданту, з’яўляўся пасрэднікам паміж ім і акругай, праводзіў візітацыю цэркваў, быў суддзёй у справах, якія маглі скончыцца прымірэннем, без парушэння царкоўных правілаў. Для вырашэння бягучых спраў акругі пробст меў права збіраць сінод пастараў.

Вышэйшым органам евангеліцка-рэфармацкай царквы з’яўляўся Літоўскі евангеліцка-рэфармацкі сінод (з 1840 г. – Віленскі). Часцей за ўсё яго сходы адбываліся ў Вільні, але час ад часу яны праходзілі ў Беліцы, Ізабеліне, Койданаве, Капылі, Слуцку, Расне, Асташыне[10]. З другой паловы XIX т.

пасяджэнні сінода адбываліся толькі ў Вільні. На яго сходы збіраліся духоўныя і свецкія асобы з дваран гэтага веравызнання. На іх разглядаліся розныя пытанні: аб матэрыяльным стане духавенства, назначэнні на пасады і інш. Усе бягучыя справы вырашала Літоўская (пазней – Віленская) евангеліцка-рэфармацкая калегія. Сінод выбіраў усіх членаў гэтай калегіі на шэсць гадоў. Кандыдатура яе прэзідэнта прызначалася імператарам, віцэ-прэзідэнта – зацвярджалася міністрам унутраных спраў.

У канцы XVIII ст. (1791 г.) на тэрыторыі ВКЛ пражывала 3 850 тыс. чалавек, з іх да евангеліцка-лютэранскай і евангеліцка-рэфармацкай канфесій належала 60 тыс.[11]. Стан сучаснай гістарычнай навукі дазваляе вылучыць колькасць вернікаў гэтых дзвюх канфесій па асобных беларуска-літоўскіх губернях толькі на 1842-х гг. Так, у Віцебскай губерні іх было 13 426, Віленскай – 954, Гродзенскай – 4 277[12]. На пачатку 1860-х гг. у беларуска-літоўскіх губернях налічвалася 19 951 чал., якія адносіліся да гэтых канфесій. Найбольшая колькасць з іх (практычна адных лютэран) пражывала ў Віцебскай губерні – 12 420 чал. (1,57 % ад агульнай колькасці насельніцтва), у Гродзенскай – 5 500 чал. (0,6%), Віленскай – 891 (0,1%), Мінскай – 684 (0,07%), Магілёўскай – 456 чал. (0,05 %)[13]. На працягу другой паловы XIX ст. колькасць вернікаў гэтых дзвюх канфесій ва ўсіх беларускіх губернях павялічылася больш чым у тры разы і на момант перапісу 1897 г. склала звыш 74,5 тыс. чал., з якіх на долю лютэран прыходзілася больш за 99%. Лютэранства спавядала латышскае і нямецкае насельніцтва, што пражывала на гэтай тэрыторыі; евангеліцка-рэфармацкую веру – палякі і беларусы, якія былі, як правіла, дваранскага паходжання.

У царкоўна-адміністрацыйнай структуры евангеліцка-рэфармацкая і евангеліцка-лютэранская цэрквы мелі шмат агульнага, але былі і невялікія адрозненні. Аснову царкоўнага ўладкавання лютэран складаў прыход. У яго ўваходзілі прыходская абшчына і пастар. Прыходскія абшчыны па сваіх правах былі неаднароднымі. У адных прыходах абшчына была самастойнай адзінкай, яе дзейнасцю кіравалі выбарныя органы – агульны сход і царкоўны савет (або калегія, канвент). У іншых – абшчыну прадстаўлялі патрон і землеўладальнікі. У першай палове XIX ст. лютэранскія кірхі (цэнтры прыходаў) існавалі ў Гродна, Мінску, Слуцку, Віцебску, Полацку і Магілёве. У 1864 г. у пяці губернях дзейнічала 27 лютэранскіх цэркваў, у тым ліку галоўных (прыходскіх) – 7, прычэтных (прыпісных) – 8, шпітальных і хатніх – 1, малельных дамоў – 11[14]. Найбольш разгорнутую структурную сетку мелі Віцебская і Гродзенская губерні.

Некалькі прыходаў у сукупнасці ўтваралі пробсцкія акругі, якія знаходзіліся пад наглядам духоўнага саноўніка – пробста. Сукупнасць

пробсцкіх акругаў утварала кансістарыяльную акругу. На пачатку 60-х гг. XIX ст. у Расійскай імперыі існавала ўсяго восем евангеліцка-лютэранскіх духоўных кансістарыяльных акруг. Усе пяць губерній (Віленская, Віцебская, Магілёўская, Мінская, Гродзенская) пасля скасавання ў 1830 г. Віленскай лютэранскай кансісторыі ўваходзілі ў Курляндскую кансістарыяльную акругу.

У аснове царкоўнага ўладкавання евангеліцка-рэфармацкай царквы таксама ляжалі прыходы (пастараты). Яны ў сваю чаргу аб'ядноўваліся ў дыстрыкты (акругі). На пачатку XIX ст. на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў існавалі акругі: Беларуская, Віленская, Занёманская (пазней Гродзенская), Жмудская. У склад Занёманскага дыстрыкта ўваходзілі пастараты, цэнтры якіх (зборы – евангеліцка-рэфармацыйныя храмы) меліся ў Ізабеліне, Ямне, Непакойчыцах, Брэсце, Асташыне, Беліцы, Зараі і Расне; Беларускага – Слуцку, Койданаве, Эйнаровічах, Копысі, капліцы ў Загаллі і Сямёнавічах; Віленскага – Вільні, Жупранах, Дзевялтове, Новым Месцы[15]. У 1830 г. у Віленскім дыстрыкце пастараты меліся ў Вільні, Дзялтаве і Новым Месцы; Жмудскім – Кейданах, Келме, Біржах, Папілысу, Саламесцісе, Новых Радзівілішках, Швабішках; Гродзенскім – Ізабеліне, Расне, Непакойчыцах, Асташыне, Зараі, Беліцы; Беларускім – Слуцку, Загаллі, Койданаве, Эйнаровічах, Капылі, Копысі, Мінску, Сямёнавічах[16].

У 1873 г. Беларуская акруга была аб'яднана з Гродзенскай пад назвай «Беларуская». Кіраванне ёю было даручана суперінтэнданту У. Мандзелеўскаму, які раней ўзначальваў Гродзенскую акругу. У 1886 г. у сувязі з адначасовай смерцю суперінтэнданта Мандзелеўскага і віцэ-суперінтэнданта Кавельмахера Беларуская акруга часова далучылася да Віленскай. Гэты «часовы» стан захоўваўся і на пачатку XX ст.[17].

За дзейнасцю пратэстанцкіх пастараў вёўся пастаянны нагляд з боку III аддзялення, якое ажыццяўляла функцыі дзяржаўнай палітычнай паліцыі і ўключала ў сваю структуру другую экспедыцыю, што займалася рэлігійнымі злачынствамі і барацьбой з «неблагонадежными и подозрительными» святарамі[18]. У дачыненні да пратэстацкіх пастараў гэта было асабліва актуальна, бо абсалютная большасць з іх была замежнага паходжання. У Зводзе Законаў Расійскай імперыі, выдадзеных у 1896 г., адзначалася: «Иностранцы в России могут только по распоряжению МВД и по представлении свидетельства о принятии ими подданства России получать дозволение занимать места пасторов…»[19]. Імкненне аспрэчыць гэтае правіла з'явілася на пачатку 1909 г., калі царкоўныя ўстановы евангеліцка-лютэранскай і евангеліцка-рэфармацкай канфесій узбудзілі сумеснае хадайніцтва аб дапушчэнні да пастырскіх пасад прапаведнікаў замежных краін без прыняцця імі расійскага

грамадзянства, а толькі на падставе прыняцця прысягі на вернасць службы[20]. Ваенна-палітычныя падзеі, што распачаліся ў хуткім часе, прымусілі ўлады прымаць зусім іншыя захады ў адносінах да святароў і вернікаў гэтых канфесій.

Адносіны пратэстантаў з адміністрацыйнымі ўладамі і пануючай праваслаўнай царквой былі звычайна памяркоўнымі. Вялікіх перашкод ім не чынілі, але пры магчымасці імкнуліся стрымліваць рост колькасці пратэстанцкіх вернікаў і культавых устаноў. У справаздачы обер-пракурора Св. Сінода за 1883 г. адзначалася: «Лютеране, которые относятся главным образом к служебному и купеческому сословью, не высказывают фанатизма в отношении православной церкви, но и не сочувствуют ей. Епархиальное начальство принимает меры по ограничению православного населения от иноверцев»[21]. Да такіх мер адносілася забарона будаваць новыя культавыя ўстановы. Так, у 1902 г. евангеліцка-лютэранская Генеральная кансісторыя ўзбудзіла хадайніцтва аб дазволе царкоўнаму савету Дзвінскага прыхода прыняць ахвяраваны ўладальнікам мяст. Прэль Гулькевічам участак зямлі (960 кв. саж.), каб пабудаваць там на сродкі веруючых новы малітоўны дом. Згодна з законамі Расійскай імперыі пабудова культавых будынкаў замежных хрысціянскіх веравызнанняў магла здзяйсняцца толькі пры згодзе праваслаўнага епархіяльнага кіраўніцтва дадзенай тэрыторыі. У вышэйазначаным выпадку такой згоды не было. Перапіска паміж віцебскім губернатарам, МУС і Дэпартаментам духоўных спраў замежных веравызнанняў паказвае, як свецкія чыноўнікі і праваслаўныя іерархі ўсяляк шукалі неабходныя абгрунтаванні, каб адхіліць хадайніцтва[22].

У 1868 г. былі ўнесены некаторыя змены ў правілы евангеліцка-лютэранскіх і евангеліцка-рэфармацкіх прыходаў: ініцыятары Віленскага рэфармацкага сінода павінны былі загадзя паведамляць Галоўнаму начальніку края аб месцы і часе сваіх сходаў, нягледзячы на тое, што гэта і не прадугледжвалася дзяржаўнымі законамі. Што да евангеліцка-лютэранскіх сінодаў у кансістарыяльных акругах, то яны праз Галоўнага начальніка края павінны былі дастаўляць у МУС копіі пратаколаў пасяджэння[23].

Спрэчныя моманты ў рэгуляванні дзейнасці пратэстанцкіх канфесій узніклі ў сувязі з распаўсюджваннем сярод насельніцтва пратэстанцкага сектанцтва. У канцы 1870-х гг. у Гомельскім павеце Магілёўскай губерні былі выяўлены прыхільнікі штундызму, які быў занесены сюды з паўднёвых раёнаў, куды жыхары павета адпраўляліся на заробкі. У 1880-я гг. штундысты з'явіліся ў Рагачоўскім павеце, у 1888 г. – у Віцебскай губерні. Але прынятыя меры (тры паслядоўнікі штундызму былі пазбаўлены маёмасці і высланы ў Закаўказзе, двое адпраўлены ў турму) спынілі яго распаўсюджванне. У

1894 г. штундызм быў аб'яўлены ў Расійскай імперыі па-за законам. З цягам часу штундызм практычна перастаў існаваць і зліўся з баптызмам.

У канцы XIX – пачатку XX ст. найбольш паслядоўнікаў меў баптызм. У беларуска-літоўскіх губернях баптысты з'явіліся спачатку ў Коўне, а потым у Вільні і Гродне. У Віцебскай губерні баптысты пражывалі ў Дзвінскім, Люцынскім і іншых паветах[24]. Яшчэ ў дасавецкія часы даследчыкі адзначалі, што баптызм у беларуска-літоўскіх губернях – нямецкага паходжання. У беларускіх губернях ён звычайна распаўсюджваўся сярод нямецкіх каланістаў і латышоў. Часцей за ўсё баптыстамі станавіліся лютэране. Але сярод іх былі і іншыя, нават «еврейский элемент», хоць і сустракаўся як адзінкавая з'ява[25].

Царскі ўрад быў занепакоены пашырэннем баптысцкага вучэння. У сувязі з гэтым у 1879 г. быў выдадзены сенацкі ўказ, які рэгуляваў дзейнасць баптысцкіх абшчын. Да ўказа дадаваліся часовыя правілы аб вядзенні метрычных запісаў шлюбаў, нараджэння і смерці. Гэтыя запісы павінны былі весці мясцовыя грамадзянскія ўлады. Для губернскіх уладаў беларускай тэрыторыі гэта быў новы, яшчэ невядомы аспект узаемаадносінаў, што іншым часам і выкарыстоўвалі духоўныя асобы ў сваіх мэтах. Так, у красавіку 1903 г. у віцебскае губернскае праўленне паступіла калектыўная скарга ад 8 сямей баптысцкага веравызнання (Дзвінскі павет). Яны скардзіліся на Лівенгофскае валасное праўленне, якое адмаўлялася весці метрычныя кнігі на іх. У адказе віцебскага губернатара гаварылася: «ходатайство о ведении … метрических книг… не подлежит удовлетворению ввиду того, что просители официально числятся лютеранами и в баптизм перешли без разрешения господина министра внутренних дел...»[26].

Прапаведнік баптыстаў Янсан выразіў нязгоду з рашэннем губернатара, сцвярджаючы, што «баптизм не есть особое исповедание, совершенно отличное от лютеранского»[27], адпаведна пераход з лютэранства ў баптызм не з'яўляецца пераходам з аднаго веравызнання ў другое і не патрабуе дазволу міністра, а метрычныя кнігі павінны весціся на падставе інструкцыі ад 15 жніўня 1879 г. валаснымі праўленнямі[28].

У Расійскай імперыі яшчэ з часоў Пятра I любыя спробы, накіраваныя на перакананне праваслаўных перайсці ў іншую веру, лічыліся недапушчальнымі. Гэтае законапалажэнне было яшчэ раз пацверджана Статутам 1832 г. адносна пратэстанцкіх канфесій. Толькі часова пры Аляксандры I урад змякчыў жорсткасць выканання гэтых нормаў, калі зацікаўленасць у Біблейскім таварыстве прымусіла дазволіць хрысціянскую прапаганду спачатку братамгернгутэрам сярод паволжскіх калмыкаў (1815–1832 гг.), а затым англійскім пратэстанцкім місіянерам у Забайкаллі (1818–1840 гг.)[29].

Расійскае біблейскае таварыства было заснавана ў 1812 г. для перакладаў, друкавання і распаўсюджвання Бібліі. У 1816 г. аддзяленні таварыства былі адкрыты ў Вільні, Магілёве і Віцебску, у 1817 г. – Мінску і Гродне. Актыўны ўдзел у стварэнні беларускіх аддзяленняў прыняў агент Расійскага і Брытанскага біблейскіх таварystваў пастар Р. Пінкертон. Па яго звестках, беларускія аддзяленні Расійскага біблейскага таварыства да 1822 г. распаўсюдзілі кніг Святога Пісання: у Віцебскай губерні – 343 экз., Мінскай – 424, Магілёўскай – 3200 экз. Але ў хуткім часе адносіны да яго з боку ўладных структур змяніліся. Расійскае біблейскае таварыства было абвінавачана ў імкненні стварыць адзіную хрысціянскую царкву, непаважлівых адносінах да праваслаўнай царквы, распаўсюджванні сектанства і падрыхтоўцы да рэвалюцыі. У 1826 г. біблейскае таварыства было забаронена[30].

Такім чынам, заканадаўчае рэгуляванне дзейнасці пратэстанцкіх канфесій на працягу XIX ст. стварала неабходныя ўмовы для іх далейшага развіцця. Урад Расійскай імперыі хоць і імкнуўся рэгламентаваць і абмежаваць іх дзейнасць, але асаблівых ганенняў не праводзіў. У аснове гэтай прыхільнасці да пратэстантаў ляжала перакананасць у тым, што для дзяржавы ад іх больш карысці, чым небяспекі. Гэты тэзіс дзейнічаў і на пачатку XX ст., калі ўрад прыступіў да распрацоўкі новага канфесійнага курса, накіраванага на лібералізацыю дзяржаўнай палітыкі і міжканфесійных узаемаадносінаў. Але Першая сусветная вайна паклала пачатак рэзкай змене палітычнага курса ў адносінах да пратэстантаў.

1 Alabrudzinska E. Koscioly ewangelickie na Kresach Wshodnich II Rzeczypospolitej. – Torun, 1999. – С. 18.

2 Цветаев Д. Протестантство и протестанты в России до эпохи Преобразований. – М., 1992. – С. 2 (Тезисы к историческому исследованию Дм. Цветаева).

3 Studnicki W.G. Kosciol ewagelicko-reformowany w Wilnie. Historia – organizacja – swiątynia. – Wilno, 1935. – С.10.

4 Baublys A. Lietuvos evangelikų reformatų bažnyčios sinodas. – Vilnius, 2006; Prašmantaitė A. Die Evangelischen Kirchen in Litauen. 1795–1918 // Die reformatorischen Kirchen Litauens. – Martin-Luter–Verlag Erlangen, 1998. – С. 137–172; Канфесіі на Беларусі. – Мінск, 1998; Яноўская В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг. – Мінск, 2002; Филатова Е.Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. – Минск, 2006.

5 Негода Ю. Повне зібранне законів Російської імперії як джерело з правового статусу лютеранської та католицької церков Півдня України (друга половина XVIII – XIX ст.) // Історія релігій в Україні. – Кн. 1. – Львів, 2014. – С. 359–367.

6 Русское православие. Вехи истории. – М., 1989. – С. 320.

7 Архив Государственного Совета. – Т. 1. – Ч. 1. – СПб., 1869. – С. 17.

8 Prašmantaitė A. Die Evangelischen Kirchen in Litauen. 1795–1918 // Die reformatorischen Kirchen Litauens. – Martin-Luter-Verlag Erlangen, 1998.

[9] Полное Собрание Законов Российской империи (далей - ПСЗРИ) Собр. 2. – Т. 5. – СПб., 1831. – С. 553–666.

[10] Spis synodow i sesji prowincjanych jednoty Litewskiej. 1611–1913. – Wilno, 1913. – С. 49.

[11] Alma Mater Vilnensis. – London, 1951. – С. 29, 66.

[12] Без-Корнилович. Военно-статистическое обозрение Российской империи. – Т. VIII. – Ч. 1. – Витебская губерния. – СПб., 1852. – С. 192; Норденстренг. Военно-статистическое обозрение Российской империи. – Т. IX. – Ч. 2. – Виленская губерния. – СПб., 1848. – С. 30; Камберг. Военно-статистическое обозрение Российской империи. – Т. IX. – Ч. 3. – Гродненская губерния. – СПб., 1849. – С. 96.

[13] Яноўская В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі. – Мінск, 2002. – С. 63.

[14] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у С.-Пецярбургу (далей - РДГА у С.-Пецярбургу. – Ф. 821. – Воп. 5. – Спр. 18. – Арк. 16.

[15] Бібліятэка Урублеўскіх Літоўскай АН (далей – БУЛАН). Рукапісны аддзел. – Ф. 40. – Спр. 833. – Арк. 13.

[16] Baublys A. Lietuvos evangelikų reformatų bažnyčios sinodas. – Vilnius, 2006. – С. 137.

[17] БУЛАН. Рукапісны аддзел. – Ф. 40. – Спр. 882. – Арк. 2–4.

[18] Лиценбергер О. А. Евангелическо-лютеранская церковь в Российской империи (XVI – XX вв.). – М., 2003. – С. 94.

[19] РДГА у С.-Пецярбургу. – Ф. 821. – Воп. 5. – Спр. 7. – Арк. 27.

[20] Нацыянальны гістарычны архіў у Мінску (далей НГАБ у Мінску). – Ф.1430. – Воп. 1. – Спр. 47603. – Арк. 2.

[21] Литовские епархиальные ведомости за 1868 год. Вильна, 1869. – С. 39.

[22] НГАБ у Мінску. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 53484. – Арк.1 – 4.

[23] РДГА у С.-Пецярбургу. – Ф. 821. – Воп. 5. – Спр. 46. – Арк. 15.

[24] НГАБ у Мінску. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 47603. – Арк. 27.

[25] Миловидов А. И. Современное штундо-баптистское движение в Северо-Западном крае. – Вильна, 1910. – С. 7.

[26] НГАБ у Мінску. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 45855. – Арк. 6.

[27] НГАБ у Мінску. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 45855. – Арк. 8 адв.

[28] НГАБ у Мінску. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 45855. – Арк. 27.

[29] История русской церкви. – Т. 8. – Ч. 2. – М., 1997. – С. 351–352.

[30] Кузняева С.А. Российское библейское общество в Белоруссии // Наш радавод. – Кн. 4. – Ч. 3. – С. 603–608.